**Дудкін**, Я. Адважны вадзіцель / Я. Дудкін // Сцяг перамогі (Лёзна). — 2009. — 14 лют. — С. 1.

## АДВАЖНЫ ВАДЗІЦЕЛЬ

23 гады таму ў Афганістане трагічна загінуў на апошнім годзе тэрміновай службы ў радах Савецкай Арміі механізатар саўгаса «Адаменкі» Аляксандр Бельчыкаў. Для ўвекавечання памяці аб ім цэнтральная вуліца ў вёсцы Альхавік, дзе жыве маці Аляксандра Яўгенія Паўлаўна і яго брат з сям'ёю, носіць імя загінуўшага воіна-інтэрнацыяналіста.

Інакш склаўся лёс яго зямляка з суседняй вёскі Адаменкі Уладзіміра Жураўлёва, які быў прызваны на тэрміновую службу ў армію крыху пазней Аляксандра, у кастрычніку 1986 года. Юнак ужо да гэтай пары авалодаў спецыяльнасцямі механізатара і вадзіцеля. Пасля праходжання курса маладога байца ў беларускім Уруччы быў накіраваны на поўдзень краіны ў г. Тэрмез. Там авалодаў ваеннай спецыяльнасцю вадзіцеля бронетранспанцёра. Апошнія паўтара гады тэрміновай службы прайшлі для Уладзіміра ў афганскім горадзе Кандагар. Служыў у інжынерна-сапёрнай роце, дзе байцы праводзілі праверку дарог, вядучых у горад, абясшкоджвалі міны.

Аднойчы ў час адпачынку пасля аб'езду свайго ўчастка трапілі пад мінамётны абстрэл. У той час раніла некалькі нашых байцоў, ранены вёў БТР у сваё размяшчэнне і Уладзімір. Тады і атрымаў сваю першую ўзнагароду – медаль «За баявыя заслугі».

Кандагар ахоўвала народнае апалчэнне «Царандой». Вакол горада размяшчаліся іх ваенныя кропкі. Аднойчы «духі» актывізаваліся і з мэтай далейшага захопу горада пазнішчылі кропкі народнага апалчэння. Перад савецкімі воінамі была пастаўлена задача аднавіць іх, абараніць горад. У адным з баёў юнак праявіў асаблівую мужнасць і быў узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У гэты час Уладзімір Жураўлёў жыве і працуе ў абласным цэнтры.

**Я. Дудкін**